View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE



**УДК 94 (476)“10”**

# РОЛЯ ЛІТВЫ Ў МІЖУСОБІЦЫ УСЯСЛАВІЧАЎ СЯРЭДЗІНЫ XII ст.

***А.А. ЗІМНІЦКІ***
**Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь**

*Даследаванне ўзаемаадносін літвы з Полацкім княствам і яго асобнымі рэгіёнамі, дазваляе выявіць паступовы выхад Літвы з шэрагу даннікаў Русі, а ў далейшым і правядзенне ёй самастойнай палітыкі ў рэгіёне. Адзначаецца, што гэты працэс трансфармацыі літоўска-старажытнарускіх адносін адбіўся і на ролі якую адыграла Літва ў супрацьстаянні Полацка і Мінска сярэдзіны XII ст. Даследаванне нешматлікіх згадак пісьмовых крыніц, у кантэксце далейшага развіцця літоўска-старажытнарускіх узаемаадносін, дае падставы меркаваць, што ўжо ў сярэдзіне XII ст. паміж прадстаўнікамі гэтых палітычных супольнасцей маглі быць усталяваны матрыманіяльныя сувязі, што выяўляецца яшчэ адным значным этапам у працэсе станаўлення Вялікага Княства Літоўскага.*

Узаемаадносінам балцкіх і фіна-вугорскіх плямён са старажытнарускімі князямі неаднойчы надавалася ўвага ў навуковых артыкулах ды манаграфіях. Літва ў гэтым шэрагу займала сваё месца, увага да якога, тым не менш, часта перакрывалася цікаўнасцю да іншых, больш глабальных ці проста вірлівых і насычаных факталагічным матэрыялам працэсаў унутранай ды знешнепалітычнай гісторыіі Саражытнай Русі. Такім чынам, Літве адводзілася роля дастаткова другарадная, хоць і перспектыўная, што выявілася ў XIII ст., калі яна здолела, у адрозненні ад іншых перэферыйных плямён, стварыць сваю дзяржаву.

Як у кожнай дзяржавы, у Вялікага Княства Літоўскага была свая перадддзяржаўная гісторыя палітычнага станаўлення. Адной з галоўных падзей гэтай гісторыі, прынамсі пісьмова зафіксаванай, было патрапленне Літвы ў данніцкую залежнасць ад Русі.

Пасля першых ваенна-палітычных кантактаў, верагодна ўжо ў канцы X ст. [1] (характар якіх праўда нельга дакладна вызначыць), у славянскім асяродку замацаваўся сам этнонім *літва*, які ў дазенай працы будзе разумець пад сабой указанне на этнічна родныя групы насельніцтва пражываючыя на блізкай тэрыторыі, без адзінай палітычнай структуры аднак ужо аб’яднаныя ва ўспрыняцці сваіх суседзяў пад аднэй назвай.

Аналіз летапісных звестак дае падставы меркаваць, што ўжо пасля датаванага 1040 г. паходу кіеўскага князя Яраслава на літву, верагодна ў выніку падзелу сфер уплыву ў Панямонні паміж Кіевам і Полацкам, літва патрапіла ў данніцкую залежнасць ад Полацка [1]. Далейшы ўдзел літвы ва ўнутраных канфліктах Полацкага княства патрабуе асвятлення той ролі якую яна ў іх адыгрывала, а таксама вызначэнне статусу ў якім яна знаходзілася ў сферы ўзаемаадносін Русі і балцкіх плямён. Храналагічныя рамкі даследавання абмежаваны сярэдзінай XII ст., часам, калі разгарнулася ўнутраная барацьба між Мінскай і Друцкай галінамі роду Усяслававічаў, за дамінаванне ў Полацкім княстве. Менавіта з гэтымі падзеямі звязаныя дзве згадкі літвы ў 1158 і 1162 гг. (з нешматлікаага шэрагу згадак да канца XII ст.) у старажытнарускім летапісанні.

***Міжусобіца Рагвалодавічаў і Глебавічаў.*** У сярэдзіне XII ст. землі Полацкага княства сталі арэнай барацьбы між нашчадкамі Рагвалода (у хрышчэнні Барыса) і Глеба, сыноў Усяслава Брачыслававіча. Як указвалася вышэй, родавымі ўладаннямі дадзеных княжацкіх галін былі Друцк і Мінск адпаведна [2, с. 37]. Сын Рагвалода (у хрышчэнні Барыса), Рагвалод Барысавіч, быў пасаджаны на полацкае княжанне верагодна ў 1146 г. пратрымаўшыся на ім да 1151 г., калі палачане паланіўшы яго адпраўляюць у Мінск і запрашаюць адтуль сабе на княжанне Расціслава Глебавіча [3, с. 446]. Дзе апошні наступныя 7 год і княжыць. У гэты ж перыяд пераразмеркаваліся і іншыя сталы: Друцк заняў сын Расціслава – Глеб, у Мінску верагодна застаўся княжыць брат Расціслава – Валадар Глебавіч [2, с. 41]. Сітуацыя змяняецца ў 1158 г. [удакладненне храналогіі – 4, с. 278] – Рагвалод Барысавіч варочаецца на полацкую палітычную арэну, заручыўшыся падтрымкай свайго родавага Друцка, з якога перад гэтым быў выгнаны Глеб [3, с. 493].

Спрабуючы вярнуь горад сыну, Расціслаў Глебавіч разам са сваімі братамі Валадаром і Усеваладам ідзе на Друцк. Горад аднак узяць не здолеў, замірыўся з Рагвалодам і вярнуўся ў Полацк [3, с. 495].

Тым не менш, ужо ў хуткім часе, верагодна з-за непаразумення з Расціславам у вектарах развіцця знешняй палітыкі княства [2, с. 42], палачане змушаюць яго вярнуцца ў Мінск і прымаюць Рагвалода Барысавіча ў Полацку. Каб канчаткова пазбавіцца пагрозы сваёй уладзе Рагвалод, сабраўшы войска з палачан, а таксама з сынамі Расціслава Мсціславіча, смалянамі, наўгародцамі і пскавічамі адразу ж вырушае на ўладанні Глебавічаў. Першым новаму полацкаму князю скарыўся Усевалад у Ізяслалі, замірыўшысь з ім, Рагвалод рушыў на Мінск, у якім сядзеў Расціслаў, дзе пасля аблогі “…створи миръ с Ростиславомъ и хрс҃тъ цѣловаша възвратишасѧ въ своѧси а Володарь не цѣлова хс҃а тѣмь ѡже ходѧше подъ Литвою в лѣсѣхъ (вылучана аутарам)” [3, с. 497].

Тым не менш, мір атрымаўся непрацяглы, у наступным годзе Рагвалод пры падтрымцы кіеўскага князя (даслаў кантынгент Торкаў) змушаны зноў ісці ў паход, каб вызваліць пасаджанага ім у Ізяслаўлі Брачыслава з менскага палону. Гэта яму ўдаецца і ён зноў заключае мір з Расціславам [3, с. 505]. У 1161 г. коратка прыгадваецца яшчэ адзін паход Рагвалода [3, с. 512], аднак досыць верагодна, што летапісец дублюе папярэднюю згадку [5]. Ва ўсякім разе, надалей імя Расціслава з летапісаў знікае.

Вывеўшы такім чынам з палітычнай гульні двух Глебавічаў, Рагвалод у 1162 годзе вырушае на трэцяга –Валадара: “Том же лѣт приходи Рогъволодъ на Володарѧ с Полотьчанъı к Городцю Володарь же не да ему полку въ дн҃е но ночь вӹступи на нь из города с Литьвою и много зла створисѧ в ту ночь ѡнѣхъ избиша а другъıӕ руками изоимаша множьство паче изъбьенъıх̑ Рогъволодъ же въбѣже въ Случьскъ и ту бъıвъ три дн҃и иде въ Дрьютескъ а Полотьску нѣ смѣ ити занеже множьство погибе Полотчанъ Полотчане же посадиша в Полотьски Василковича” [3, с. 519].

Пасля гэтага на Полацкім стале замацоўваецца Усяслаў Васількавіч, нашчадак Святаслава Усяславіча. Якога тым не менш у 1167 г. выганяе герой папярэдніх падзей князь Валадар (верагодна ўжо як Менскі князь): “Том же лѣт̑ поиде Володарь Глѣбовичь к Полотьску ратью Василковичь же Всеславъ поиде противу ему с Полчанъı Володарь же оувѣдавъ ѡже идуть противу ему не да ему съвъкупитисѧ и вдари на них̑ изнезапъı и много ихъ изби а инѣхъ руками изоимаша…” затым займае Полацк, і адразу ж пасля гэтага пераследуючы, свайго апанента, Валадар ідзе на Віцебск. Адкуль, пасля сутыкнення з князем Давыдам і атрымаўшы звесткі пра падыход Расціслава са Смаленска яго войска панічна адступае, наганяемае віцебскім князем “…и пусти но них̑ и не постигоша их̑ но по лѣсу блудѧщихъ много изоимаша” [3, с. 526–527]. Пасля падзей пад Віцебскам, полацкі стол зноў займае Усяслаў Васількавіч, а імя Валадара на старонках пісьмовых крыніц больш не прыгадваецца. Гэтым жа часам сканчваюцца і звесткі пра якую-кольвек палітычную актыўнасць менскіх князей.

Такім чынам, падводзячы першыя вынікі з прыведзеных летапісных згадак, можна адзначыць, што ўнутраная барацьба паміж Усяславічамі праходзіла пры актыўным удзеле тых ці іншых саюзных кантынгентаў. Так Рагвалода атыўна падтрымліваў чарнігаўскі князь Святаслаў Ольгавіч, а таксама князь Расціслаў Мсціславіч. Шмат у чым гэта вырашала пераможны ход барацьбы Рагвалода. У той жа час разам з Глебавічамі не ўзгадваюцца якія-небудзь істотныя саюзнікі з Русі. Відавочна, што на першых этапах барацьбы, свае інтарэсы яны адстойвалі абапіраючыся на свае сілы.

Аднак Валадар Глебавіч, у той жа час згадваючыся ў летапісах чатыры разы [6, с. 11], двойчы згаданы разам з літвой. Менавіта ў ёй гэты князь знайшоў таго саюзніка якога не ставала яго братам. Не згадваецца літва падчас паходу Валадара на Полацк у 1167 г., тым не менш, нельга пагадзіцца з катэгарычнасцю меркавання, што ў гэты час яна не ўдзельнічала ў ваенных аперацыях гарадзецкага князя [5]. Хоць і досыць ускосна, але на яе прысутнасць, можа ўказваць падабенства дзёрзкіх тактычных крокаў пад Полацкам на падзеі пад Гарадцом (параўнаць: 1162 г. – “…не да ему полку въ дн҃е но ночь вӹступи на нь из города с Литьвою и много зла створисѧ в ту ночь ѡнѣхъ избиша а другъıӕ руками изоимаша множьство паче изъбьенъıх…” і 1167 г. – “…и вдари на них изнезапъı и много ихъ изби а инѣхъ руками изоимаша…”).

Пры гэтым варта яшчэ раз адзначыць спецыфічнасць згадак літвы, калі яна звязваецца ў летапісным кантэксце толькі з асобай аднаго князя.

Дакладная лакалізацыя Гарадца, як валодання Валадара, нажаль немагчыма. Па меркаванні Л.В. Аляксеева, гэта магла быць сучасная Гарадзея (недалёка ад Несвіжу), альбо в. Гарадзішча недалёка ад Баранавічаў, месцы якія знаходзяцца недалёка ад Слуцка, куды сыходзіў Рагвалод пасля паразы пад Гарадцом [4, с. 184]. У любым выпадку, мяркуючы па звестках летапісаў, гэта быў населены пункт, размешчаны ў межах Мінскага княства, а значыць недалёка ад геаграфічнага месца рассялення літвы, на гэта ўказвае і факт згадкі Гарадца ў “Слове пра паход Ігараў” [7, с. 55], дзе менавіта на гарадзецкага князя прыйшлася адзна з першых сутычак з літвой у першай палове 80-х гг. XII ст. [6, с. 21,25].

***Літва напярэдадні і пасля супрацьстаяння Усяслававічаў.*** Варта абмаляваць стан літвы ў якім яна аказалася ў XII ст. Як ужо адзначалася вышэй, пасля паходу Яраслава Уладзіміравіча 1040 г., па дамоўленасці з полацкім князем Брачыславам літва становіцца даннікам Полацка. На 70-я гг. XI ст. гэта падцвярджаецца аналізам спісу даннікаў Русі змешчаным ў Аповесці мінулых часоў [1].

У далейшым летапісец пазначае паход кіеўскага князя Мсціслава Уладзіміравіча з Вольгавічамі і іншымі саюзнікамі на літву пад 1132 г., калі разрабаваўшы яе землі, кіеўляне, якія адсталі ад княжацкага войска былі моцна пабітыя літвой. Як ўжо дзначалася шматлікімі даследчыкамі, дадзеная ваенная аперацыя была непасрэдна звязана з папярэдняй высылкай полацкіх князеў у Візантыю [8, с. 32], [4, с. 263], [9, с. 22], [10, с. 154] і жаданнем пазбавіць Полацк яго данніка [5]. Тым не менш, на гэтым этапе яшчэ нельга казаць пра атрыманне літвой поўнай незалежнасці. Падцверджаннем гэтага можа служыць адсутнасць звестак пра самастойныя якія-кольвек ваенна-палітычныя акцыі літвы.

Першая з такіх акцый у старажытнарускім летапісанні дакладна пазначаецца толькі пад 1183 г. – калі пскавічы біліся з літвой [11, с. 37], а ў 1185 г. літоўская выправа здзяйснялася на даннікаў Полацка ліваў, на што ўказвае Генрых Латвійскі [12, с. 71]. Досыць верагодна, што сутыкненні пачаліся яшчэ раней, да пачатку 70-х адносіцца згадка у Стрыйкоўскага ў "Kronika Polska, Litewska, Żmódzka i wszystkiej Rusi", калі князь Раман Расціслававіч разбіў рабуючую кіеўскія землі літву і яцьвягаў [13, с. 202]. Хаця дадзеныя звесткі могуць быць указаннем толькі на яцьвяжскі паход, а літва дабаўлена толькі як літаратурная звычка пры згадцы язычнікаў.

Тым не менш, з вышэй апісанага ваенна-палітычнага становішча мы атрымоўваем досыць працяглы прамежак часу у межах якога статус літвы нельга вызначыць адназначна. Пасля ссылкі полацкіх князей ў Візантыю, пахода 1132 г. і да пачатку самастойных ваенна-палітычных акцый, літва ўдзельнічае ў міжусобіцы князей Усяславічаў, нягледзячы на яе значную ваенную ролю ў апісаных падзеях, крыніцы не ўказваюць на яе статус: удзельнічае яна яшчэ як даннік, альбо ўжо як незалежны саюзнік?

***"Ходяше подъ Литвою в лесахъ."*** Пры разглядзе ўзаемаадносін балцкіх плямён і Русі ў XII ст. па прычыне малалікасці крыніц, кожнаму факту надаецца падвоеная ўвага, асабліва, калі гэты факт нечым вылучаецца сярод іншых. Так, сярод прыведзеных у даследаванні летапісных згадак, пазнака, што Валадар "…ходяше подъ Литвою в лесахъ", па сваёй форме выглядае досыць незвычайна. У даследчыкаў трактоўка гэтага месца мае звычайна два варыянты: у значэнні "хадзіў пад правадырствам літвы ў лясах, ці падначалены літве" і ў значэнні "хадзіў у лясах каля літвы". Нельга пагадзіцца з катэгарычнасцю меркавання А.С. Кібіня [14, с. 132], у тым што гэты выраз быў выкарыстаны толькі ў сваім другім, геаграфічным сэнсе, у першую чаргу, гэта бачна па аналізе Кіеўскага зводу Іпацьеўскага летапісу, дзе змешчана згадка. Прыназоўнік "подъ/под" там акрамя згаданага выразу выкарыстоўваецца 59 разоў, дваццаць разоў у значэнні геаграфічным (напрыклад "ѣздѧщю подъ градомъ" [3, с. 287, а таксама 411,445 і інш]), трыццаць пяць – у значэнні прыналежнасці/падначаленасці чагосці ці кагосьці (напрыклад "подъ кн҃земъ своимъ", "подъ собою Киевъ" [3, с. 324, 475, і інш.]), і тройчы як звязанае з асобай чалавека, ці прадмета (кшталту "подъ руцѣ" [3, с. 463]), аднойчы сустракаецца выраз падобны па пабудове на разглядаемы "…и быс҇ велми боленъ и ста подъ Вышегородомъ въ Ѡстровѣ…"[3, с. 320], у адрозненні ад разглядаемага, ён дае канкрэтныя лакальныя прывязкі, што не падобна на размытыя паняцці "літвы" і "у лясах".

Праведзены колькасны разгляд пакуль не можа стоадсоткава ўказваць і на "падначалены" статус знаходжання там Валадара. Тым не менш, спыняючыся на гэтым значэнні выразу, можна разгледзець магчымую мэту знаходжання там Валадара. "Падначалены" стан меў на ўвазе верагодна нейкія вайковыя аперацыі ўнутрылітоўскага, мясцовага значэння (таму летапісец і абмяжоўваецца недакладным – "*в лесахъ*"), у якіх па ініцыятыве літвы ўдзельнічаў гарадзецкі князь.

***Падабенства князей.*** Варыянты цеснай супрацы літвы і рускіх князёў да канца XII і цягам XIII стст. сутракаецца неаднаразова. Аднак, зыходзячы з характару наяўнай інфармацыі ў старажытнарускім летапісанні, можна казаць, што галоўнымі ініцыятарамі гэтых паходаў былі рускія князі, а літва выкарыстоўвалася хутчэй як найманы кантынгент. У той жа момант Генрых Латвійскі на старонках сваёй "Хронікі Лівоніі" апісвае сітуацыю, якая выбіваецца з агульнага шэрагу: "…Ибо Король Всеволод (Vissewalde) из Герцикэ всегда был врагом христианского рода, а более всего латинян. Он был женат на дочери одного из наиболее могущественных литовцев. И, будучи, как зять его, для них почти своим, связанный с ними сверх того и дружбой, часто предводительствопап их войсками облегчал им переправу через Двину и снабжал их съестными припасами, шли ли они на Руссию, Ливонию или Эстонию." [12, с. 125] А таксама адна з умоваў пры заключэнні Рыжскім епіскапам міру з Усеваладам: "…не станешь вместе с литовцами разорять землю твоих русских христиан" [12, с. 127].

Дадзеныя звесткі і высокая ваенная актыўнасць літвы ў той час, скіраваная супраць рыжан, балцкіх плямён і Русі, сведчаць пра ўскосную, ці непасрэдную магчымасць удзелу там і асобных рускіх князёў. Агульны сэнс паведамлення Генрыха указвае на тое, што ініцыятыва гэтых сумесных акцый верагодна належыла літоўскім правадырам, што зближае дадзены аповед з падзеямі якія адбываліся на паўстагоддзя раней у выпадку з Валадаром. Далейшая прысутнасць літвы ў этапах супрацьстаяння з Рагвалодам Барысавічам магла быць паказнікам удзячнасці літвы і падтрымання цесных сувязей з гарадзецкім князем. Трэба адзначыць таксама факт, якім былі абумоўлены такія цесныя сувязі герцыкскага князя і літвы, – дынастычны шлюб. Стаўшы адным з шляхоў развіцця ўнутранай і знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага, з другой паловы XIII ст., гэта з'ява існавала, такім чынам, яшчэ ў пачатку XIII ст. як форма палітычных памкненняў літвы ў выбудове ўзаемаадносін з рускімі княствамі.

У палітычных сітуацыях, у якіх знаходзіліся Усевалад і Валадар, можна таксама знайсці пэўныя рысы падабенства. Сярод іх: перэферыйнасць земляў у якіх яны княжылі; адносная іх блізкасць да літвы, што абумоўлівала ўсталяванне з ёй тых ці іншых сувязей; наяўнасць моцных знешніх ворагаў (у выпадку Усевалада –гэта рыжане, у выпадку Валадара – гэта шматлікія саюзнікі Рагвалода Барысавіча), а таксама напружаныя адносіны з Полацкім князем (адносна Усевалада на гэта досыць пераканаўча ўказваў Л.В.

Polotsk.su

Аляксееў [4, с. 258]). Усё гэта наштурхоўвае на думку, што паміж літвой і князем Валадаром Глебавічам да сярэдзіны XII ст. маглі быць усталяваны матрыманіяльныя сувязі, якімі можа тлумачыцца і прывязка згадак літвы толькі да яго імя ў разглядаемых падзеях.

Нягледзячы на малалікасць крыніц і іх фрагментарнаць, з пэўнай доляй умоўнасці можна рэканструяваць працэс развіцця ўзаемаадносін літвы са Старажытнай Руссю ў XII ст.

З'яўляючыся на першых этапах даннікам Полацкага княства, літва ў далейшым здолела трансфармаваць гэтую залежнасць ў больш цесныя сувязі матрыманіяльнага характару, што адлюстравалася падчас разгортвання барацьбы Усяславічаў сярэдзіны стагоддзя за дамінаванне ў Полацкім княстве. Літва стала досыць істотнай ваеннай сілай, якую верагодна за кошт сваіх асабістых сувязей і двухбаковага ўзаемавыгаднага ваеннага супрацоўніцтва, скарыстаў Валадар Глебавіч. Роля літвы, як матрыманіяльнага саюзніка, дазволіла Валадару ў ваенным плане стварыць супрацьвагу знешняй дапамозе, якую атрымоўваў яго супернік Рагвалод Барысавіч.

Значнасць ваеннай ролі, якую адыграла літва ў барацьбе полацкіх Усяславічаў, а таксама ўсталяванне ёй матрыманіяльных сувязей з рускімі князямі стала "трамплінам" да ўзвышэння хутчэй самой літвы чым Мінскага княства, якое пасля апісаных падзей знікае са старонак летапісаў. У той жа час літва пачынае здзяйсняць ужо самастойныя ваенныя выправы на Русь і іншыя землі. Наяўнасць такіх саюзаў палягчала правядзенне грабежніцкіх паходаў у пачатку XIII ст., а па меркаванні некаторых даследчыкаў [15, с. 31–33], магло істотным чынам паўплываць і на непасрэдны працэс афармлення Вялікага Княства Літоўскага ў сярэдзіне XIII ст., што, аднак, патрабуе далейшага даследавання.

ЛІТАРАТУРА


1. Зімніцкі, А.А. "Языци, иже дань дають Руси" : да пытання данніцкай залежнасці літвы ў XI ст. (па матэрыялах пісьмовых крыніцах) / А.А. Зімніцкі // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки. – У друку.
2. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля / Л.В. Алексеев ; вст. ст. Л.Ф. Данько, А.И. Судника. – Полоцк : А.И. Судник, 2007. – 50 с.
3. Ипатьевская летопись // Полное собрание русских летописей. – 2-е изд. – СПб. : тип. М. А. Александрова, 1908. – Т. II. – 938 с.
4. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля в IX–XIII вв. (очерки истории северной Белоруссии) / Л. В. Алексеев. – М. : Наука, 1966. – 295 с.
5. Баранаускас, Т. Истоки Литовского государства [Электронный ресурс] / Т. Баранаускас. – Режим доступа: http://viduramziu.istorija.net/ru/state.htm. – Дата доступа: 01.04.2016.
6. Загорульский, Э.М. Генеалогия полоцких князей Изяславичей / Э.М. Загорульский. – Мінск : ВУЗ-ЮНИТИ, 1994. – 30 с.
7. Слово о полку Игореве // Памятники литературы и искусства XI–XVII вв. – М., 1978. – 120 с.
8. Любаўскі, М. Літва і славяне ў іх узаемаадносінах у XI–XIII сталеццях / М. Любаўскі // Arche. – 2009. – 7(82). – С. 29–51.
9. Ochmański, J. Litewska granica etniczna na wschodzie od epoki plemiennej do XVI wieku / J. Ochmański. – Poznań : Wydawnictwo Naukowe UAM, 1981. – 84 s
10. Насонов, А.Н. Русская земля и образование территории древнерусского государства : историко-географическое исследование / А.Н. Насонов. – М., 1951. – С. 263.
11. Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. – М. ; Л. : Изд-во АН СССР, 1950. – 568 с.
12. Генрих Латвийский. Хроника Ливонии / введ., пер. и коммент. С.А. Аннинского. – 2-е изд. – М. ; Л. : АН СССР, 1938. – 352 с.
13. Stryjkowski, M. Kronika Polska, Litewska, Żmódzka i wszystkiej Rusi / M. Stryjkowski. – Warszawa, 1846. – T. 1. – 453 s.
14. Кибинь, А.С. От Ятвязи до Литвы: политические и социокультурные трансформации в бассейне Верхнего Немана в X–XIII веках / А.С. Кибинь. – М. : Квадрига, 2012. – 269 с.
15. Семянчук, Г. Да пытання аб пачатках Вялікага княства Літоўскага ў сярэдзіне XIII ст. (яшчэ адна версія канструявання мінуўшчыны) / Г. Семянчук, А. Шаланда // Bialoruskie Zeszyty Historyczne. – 1999. – 11. – S. 18–44.


## THE ROLE OF LITHUANIA IN VSESLAVICH'S INTESTINE STRIFE IN THE MIDDLE OF THE XII CENTURY

***A. ZIMNITSKI***

*The study of relations between Lithuania and the principality of Polotsk and its individual regions, reveals the gradual emergence of a number of tributaries Lithuania Russia, and later holding her independent policy in the region. This process of transformation of the Lithuanian-Old Russian relations also affected the role played by Lithuania in the confrontation of Polotsk and Minsk middle of the XII century. The study mentions the few written sources, in the context of the further development of Lithuanian-Old Russian relations, gives reason to believe that already in the middle of the XII century. between the representatives of these political supolnastey could be set matrymaniyalnyya connection that manifests another significant step in the process of becoming Grand Duchy of Lithuania.*



Polotsk SU